*Ала Нікіфарэнка*

# СІМВОЛІКА ПРАДМЕТАЎ ПОБЫТУ НА БЕЛАРУСІ

Вялікі сімвалічны сэнс у беларусаў маюць асабістыя прадметы, якія існавалі ў кожнай хаце, незалежна ад заможнасці сям'і. Неад'емным прадметам абсталявання беларускага жылля быў стол. Ён знаходзіўся ў чырвоным куце, таму відавочна меў «статус», яго вобраз атаясамліваўся з сімволікай зямлі. На Каляды, калі стол накрываўся абрусам, пад абрус клалі слой саломы ці сена, што, як лічылі, павінна было паспрыяць добраму ўраджаю ў будучым годзе [4, с. 253][1]. У чырвоным куце над сталом вешалі саламянага «павука» — як лічаць, вобраз жыватворнага сонца. Знаходжанне гэтага салярнага сімвала над сталом стварае вобраз асветленай сонцам зямной паверхні.

Сімвалізуючы зямлю, якая дае селяніну-хлебаробу дабрабыт і шчасце, стол набываў сакральнае значэнне яшчэ і таму, што ён знаходзіўся ў самым пачэсным месцы дома — у чырвоным куце, дзе, як мы ужо адзначалася, віселі абразы, клаліся свянцоныя свечкі, духоўныя кнігі і да т. п. Акрамя таго, чырвоны кут сімвалічна ўказваў на святло, на божую старану, таму і стол набываў свяшчэннае значэнне. У сімволіцы крыніцы стала прасочваецца яго сувязь з небам, з вышэйшымі сіламі дабра. Вакол стала, як вакол аналоя ў царкве, рабіліся рытуальныя дзеянні ў час сямейных урачыстасцей [6, с.19]. Напрыклад, калі быў гатовы рытуальны вясельны каравай, маладую прыводзілі ў хату і яна, атрымаўшы благаславенне бацькоў, за сватам тры разы абыходзіла вакол стала. Таксама і малады ў час абраду спросін павінны быў услед за сватам тры разы абыйсці стол. Падобны абрад не раз яшчэ паўтараўся за час вяселля. Трэба сказаць, што рытуальнае абыходжанне вакол стала (звычайна тры разы) — у беларусаў было наогул вельмі распаўсюджанае абрадавае дзеянне. Так, бабка-павітуха пасля купання, трымаючы нованароджанае дзіця на руках, разам з кумам тры разы абыходзіла вакол стала, на якім ляжаў хлеб [6, с.20].

Сакральнасць стала вызначалася яшчэ і тым, што на яго клалі самае дарагое — хлеб, свянцоныя свечкі, ставілі святую ваду. Таму на стол нельга было пускаць котку ці поўзаць неразумнае дзіця [7, с.317]. Безумоўна ж, нельга было і даросламу сесці ці стаць нагамі на стол. Са сталом як важным прадметам у сімволіцы жылля быў цесна звязаны абрус. Звычайна стол у хаце стаяў непакрыты, але ва ўрачыстыя, рытуальна адзначаныя моманты ён накрываўся абрусам. Таму можна лічыць, што ў старажытнай беларускай хаце абрус меў больш сімвалічную, абрадавую функцыю, чым утылітарную. На абрус пераходзіла значная частка сакральнага сэнсу стала. Трэба адзначыць, што абрус у некаторых выпадках, – напрыклад, у час памінак на могілках, калі на яго, разасланага на зямлі, ставілі памінальныя стравы, — сімвалічна замяняў стол. Стол жа, у сваю чаргу, у хаце пачынаў найбольш актыўна рытуальна дзейнічаць менавіта тады, калі пакрываўся абрусам у час нейкіх свят ці абрадавых дзеянняў [5].

У абрадавым сімвалічным плане стол і абрус стваралі цеснае адзінства, былі неад'емныя адзін ад аднаго. Заўважым, што на непакрытай паверхні стала не рабіліся ніякія сімвалічныя выявы, што, увогуле, дзіўна для прадмета з такой вялікай сімвалічнай функцыяй. Але гэтая супярэчнасць здымаецца тым, што сімвалічныя выявы рабіліся менавіта на абрусе. Вышываны ці тканы рытуальны арнамент, што наносіўся на абрус, адпавядаў абрадавай, сімвалічнай ролі, якую адыгрываў стол у жытле. Тут можна было сустрэць арнамент з ромбаў — сімвала зямлі, урадлівай глебы, раслінны арнамент, што меў магічную засцерагальную функцыю і наносіўся на рытуальна адказныя аб'екты рэчавага свету [6, с.21].

Блізкім па функцыянальна-рытуальнай ролі да абруса быў ручнік. У хаце яго часам клалі на стол замест абруса, на могілках на Дзяды ён таксама часам выкарыстоўваўся ў ролі абруса, калі на яго ставілі памінальныя стравы [1, с. 94]. Як і абрус, ручнік у жытле функцыянальна і рытуальна быў звязаны са сталом. Ручніком выціралі рукі, калі іх мылі перад тым, як сесці за стол. Ручнікі-«набожнікі», якімі ўпрыгожвалі абразы, з'яўляліся прыналежнасцю чырвонага кута, дзе стаяў стол. Трэба адзначыць, што ручнік у народным жыцці адыгрываў вельмі разнастайныя сімвалічныя ролі. Ён ужываўся і ў час хрэсьбін як сімвал будучага шчасця немаўляткі, і ў час вяселля пры пажаданні дабрабыту жаніху і нявесце, і ў час пахавання як сімвалічная сувязь з продкамі.

Багатай была сімволіка у дзяжы. Яна была знакам мужчынскага і жаночага пачатку ў беларускім светаўстпрыманні. На Палессі існаваў рытуал ачышчэння дзяжы. Ён адбываўся напярэдадні Пасхі. Дзяжу мылі, націралі соллю, часныком, абкурвалі воскам і хмелем, каб яна ўвесь год была чыстай і ў ёй ладзіўся хлеб. Потым дзяжу накрывалі накрыўкай або пераварочвалі, засцілалі абрусам ці ручніком, павязвалі чырвоным жаночым поясам, зрэдку — ручніком ці хмелем. Перад усходам сонца дзяжу выносілі ў двор і пакідалі на высокім месцы. Сімвалічны сэнс гэтага абраду быў у тым, каб прыстасаваць дзяжу к моцы вясновага сонца.

Трэба таксама адзначыць сімволіку дзяжы ў сямейных абрадах. Пад час выпякання вясельнага караваю да дзяжы ставілі чатыры запаленыя свечкі (на скрыжаванне); калі цеста вымалі з дзяжы, у яе ўтыкалі нож; калі каравай быў ужо ў печы, дзяжу разбівалі. Увесь абрад меў сімвалічна-эратычны сэнс: як

[1] Да таго ж вядома, што сена пад калядным абрусам – адсылка да немаўляці-Хрыста, пакладзенага ў яслі (Рэд.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гатуюць і пякуць каравай, так і дзяўчына пераходзіла ў іншы этап жыцця («Што хацелі, то зрабілі: з цеста пеляніцу, з дзеўкі маладзіцу») [2].

Пад час вяселля існаваў таксама і абрад саджання на дзяжу. На Палессі ён зваўся як «пасад», асноўным эпізодам якога з'яўлялася саджанне нявесты і жаніха на дзяжу (пры гэтым дзяўчыне змянялі прычоску і галаўны ўбор). У другой палове XIX — пачатку XX ст. права сядзець на дзяжы мелі толькі цнатлівыя жаніх і нявеста. Лічылася, што калі «нячэсная» дзяўчына наступае на дзяжу, тады не будзе радзіцца хлеб, пладзіцца жывёла, будуць дзеткі паміраць. Такім чынам, звязаныя з дзяжой абрады уплывалі на грамадскі парадак, на лад у прыродзе; а яго парушэнне прыводзіла да хаосу не толькі ў сям'і, а таксама і ў навакольным свеце.

Трэба адзначыць, што ў Беларусі ўсе рэчы, якія спрыяюць выпяканню хлеба сімвалізавалі дабрабыт і шчасце. Тут таксама можна ўзгадаць традыцыю пераноса ў новы дом метавіта гэтых прылад, каб захавць у сям'і гэтыя якасці.

Прыгатаванне каравая ў дзяжы таксама сімвалізавала «выпяканне» дзіцяці ў матуліным улонні. Такі сэнс мае сімволіка з хлебнай лапатай. У Беларусі існаваў абрад «перапекання» дзіцяці. Яго сутнасць была ў тым, што маці саджала хворае дзіця ў печ на хлебнай лапаце (ці толькі прыкідвалася што хоча гэта зрабіць). Сімвалічнасць абраду заснавана на сходнасцю выпякання хлеба і з'яўленнем дзіцяці на свет. Дзіцё як быццам вярталі ў маціна ўлонне (печ), каб ён нарадзіўся зноў.

Сярод іншых рэчаў побыту, якія маюць сімвалічны характар, трэбы адзначыць рэшата, лыжкі і нож. Першы з іх адлюстроўвае прадстаўленне аб тым, што дождж прасейваецца праз рэшата. Таму каб выклікаць дождж, трэба ліць ваду менавіта праз яго. І гэтая вада для беларусаў набывала лекавыя якасці, таму вельмі часта выкарыстоўвалася ў народнай медыцыне.

Асаблівая сімвалічная значнасць лыжкі была ў тым, што гэта быў адзін з нешматлікіх асабістых прадметаў селяніна. Лыжкі заўсёды значылі, таму што забаранялася карыстацца чужымі. Асаблівую магічную сілу набывала лыжка мужчыны. Напрыклад, гаспадарскую лыжку выкарыстоўвалі ў народнай медыцыне, а лыжку нежанатага малайца – у любоўнай магіі. Існавалі пэўныя правілы абыходжанняў з лыжкамі падчас паўсядзённай і памінальнай вячэры, а таксама розныя спосабы абрадавага частавання продкаў. Напрыклад, калі пакласці лішнюю лыжку на стол, то ею будуць есці чорт ці пачвары. А апошнія могуць трапіць у міску па лыжцы, якая ляжыць на краю. Гэтыя правілы і забароны дэманструюць распаўсюджанне рознай варажбы. У ноч пад Ражство (зрэдку — Вадохрышча) ўдзельнікі вячэры пакідалі свае лыжкі на стале, складаючы іх венчыкам па краях міскі з рэшткамі куцці. Калі лыжка за ноч перавернецца, тады яе ўладальнік памрэ на працягу года. Лічылася, што пераварочванне лыжкі звязана з тым, што ноччу ёй карысталіся памёрлыя. Таксама існавала шмат забаронаў, якія былі звязаны менавіта з лыжкамі, таму што гэты прадмет меў сімвалічную сувязь з паводзінамі і адносінамі як з памерлымі, так і рознымі пачварамі. Чалавек, які парушаў пэўыя правілы, ці сам суадносіўся з нячытай сілаю, ці даваў падставы для ўмешвання розных пачвар у яго жыццё і побыт.

Што тычыцца сімволікі нажа, то трэбы вызначыць яго рознабаковыя рытуальныя функцыі. Нож выкарыстоўвалі як абярэг для нованароджанага, парадзіхі, жаніха і нявесты. Гэты прадмет сімвалізаваў самастойную актыўную сілу, як бы канцэнтруючы ў сабе пэўную дзею. У сувязі з гэтым існавалі розныя сказанні пра нож, які закінуты ў завіру і трапіў у чорта. Вядомы звесткі пра тыя абрады, дзе выкарыстоўвалі менавіта металічныя рэчы — нож, іголкі і інш. (напрыклад, навядзенне псавання). Так, нож сімвалізаваў як пазітыўныя, так і негатыўныя якасці ў жыцці чалавека, асабліва тыя, якія знаходзіліся на мяжы «свайго» і «чужога», «светлага» і «чорнага» і г.д.

Даволі часта сярод сімвалічных рэчаў беларусаў вызначаюцца ступка і таўкач. Іх сімволіка заснавана на антрапарфізацыі, пры якой акцэнтуюцца палавыя прызнакі. На Палессі пад час вясельных абрадаў ступка і таўкач вельмі шырока выкарыстоўваліся ў розных камічных і парадыйных эпізодах. Многія з іх мелі эратычную афарбоўку. Напрыклад, абрады таўчэння вады ў ступе, адзявання ступы жанчынам, а таўкача — мужчынам, парадынае вянчанне вакол ступы.

Такім чынам, шмат прадметаў, якія знаходзіліся ў хаце беларусаў, мелі сімвалічны сэнс. Яны заўсёды выкарыстоўваліся ў самых розных абрадах як сямейна-бытавых, так і земляробчых. Асабліва вызначаюцца тыя прадметы, якія звязаны з прыгатаваннем хлеба. Набываючы функцыю прадметнага сімвала, такія рэчы былі, з аднаго боку, прыстасаваннем, з дапамогай якога чалавек спрабаваў уздзейнічаць на прыроду, а з другога — асаблівай прасторай, дзе ён набываў магчымасці ўзаемадзеяння з іншым светам.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А.Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.: іл.
2. Беларускі фальклор : Энцыклапедыя : у 2 т. Т. 1 / рэдкал. Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – 832 с.
3. Валодзіна, Т. Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 1999. – 166 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Киркор, А. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, эмономическом и бытовом значении / А. Киркор. – СПб., 1882. – Т. 3. – 108 с.
5. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск : Ураджай, 2001. – 305 с.
6. Ленсу, Я.Ю. Сімволіка рэчавага асяроддзя як элемент духоўнага свету беларускага народа: манагр / Я.Ю. Ленсу. – Мінск : МІК, 2007. – 144 с.
7. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности. – Витебск, 1895. – 552 с. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://by.ethnology.ru/by_lib/nkfrvsk_01/ graf/nkfrvsk_01_cont.html. – Дата доступа: 15.02.2009.
8. Чаропка, В. Сімвалы роднага краю / В. Чаропка // Беларуская мінуўшчына. – 1997. – №5. – С. 58–62.
9. Этнаграфія Беларусі : Энцыклыпедыя / рэдкал.: І.П.Шамякін [і інш.]. – Мінск : БелСЭ Д989. – 575 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ